русі (VII—X ст.) // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў: Зб. навук. прац: У 2 ч. Ч. 1. Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі. Мн., 2000.
3. Автократия // Лехин И. В., Струве М. Э. Краткий политический словарь. М.,1969.
4. *Моносзон Э. И.* Образование // Педагогическая энциклопедия: В 4 т. М., 1966. Т. 3.
5. АиФ. 2001. № 27.
6. *Пілецкі В. А.* Фармацыйная і цывілізацыйная канцэпцыі эвалюцыі гістарычнага працэсу ў дачыненні да гісторыі Беларусі // Гісторыя: праблемы выкладання. 2002. № 1.
7. *Дейнеко М. М.* Школа // Педагогическая энциклопедия: В 4 т. М., 1968. Т. 4.
8. *Пілецкі В. А.* Аб часе з'яўлення элементаў школьнай палітыкі ў выхаваўча-адукацыйным працэсе на Беларусі // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні: Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. Мінск, 27 сакавіка 1999 г.: У 2 ч. Мн., 1999. Ч. 1.
9. Мялецій Сматрыцкі // Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. / М. А. Ткачоў, У. С. Пасэ, Г. Р. Сянькевіч і інш.; Пад рэд. М. А. Лазарука і інш. Мн., 1985. С. 101—105.
10. *Булыка А. М.* Слоўнік іншамоўных слоў: У 2 т. Мн., 1999. Т. 1. С. 383.

*SUMMARY*

*Two conceptual categories which mark special interrelation in the historical evolution of the process of upbringing and education are characterized.*

УДК 636.4

*А. П. Жытко*

## РАЗВІЦЦЁ ДВАРАНСКА-ПАМЕШЧЫЦКАЙ СВІНАГАДОЎЛІ Ў БЕЛАРУСІ. 1861–1914 гг.

Важнай галіной развіцця памешчыцкай жывёлагадоўлі з'яўлялася свінагадоўля. Неабходна адзначыць, што ў першыя дзесяцігоддзі скасавання прыгону памешчыцкая гандлёвая свінагадоўля, відаць, не атрымала значнага развіцця. Свінні звычайна разводзіліся для задавальнення асабістых патрэб уласнікаў маёнткаў, а прырост ішоў галоўным чынам за кошт сялянскіх гаспадарак. У цэлым у парэформенныя гады тэмпы развіцця свінагадоўлі былі высокімі. Як паказвае табліца, колькасць свіней у 5 заходніх губернях з 1856 да 1911 г. павялічылася з 949,3 тыс. да 2 108,4 тыс. галоў, альбо ў 2,2 разы. Найбольшы

прырост прыпадаў на Мінскую і Гродзенскую губерні (у 2,7 і 2,5 разы адпаведна). У Мінскай губерні быў зафіксаваны і найбольшы абсалютны лік свіней (643,8 тыс. галоў, ці 30,5 % ад агульнай колькасці), а найменшы — у Віцебскай губерні (309,4 тыс. галоў, ці 14,7 %)[1].

*Табліца 1*

**Дынаміка колькасці свіней у 5 заходніх губернях (тыс. галоў) [1]**

| *Губерні* / *Год* | *Віленская* | *Віцебская* | *Гродзенская* | *Мінская* | *Магілёўская* | *Разам* |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1856 | 168,5 | 136,3 | 179,5 | 236,1 | 228,9 | 949,3 |
| 1864 | 214,0 | 224,0 | 223,0 | 254,0 | 260,0 | 1 175,0 |
| 1870 | 256,4 | 168,6 | 256,8 | 321,3 | 219,9 | 1 223,0 |
| 1883 | 237,0 | 209,6 | 319,0 | 396,6 | 310,8 | 1 473,0 |
| 1900 | 416,0 | 344,5 | 265,2 | 600,8 | 473,8 | 2 100,3 |
| 1910 | 357,3 | 323,0 | 440,7 | 668,8 | 409,4 | 2 199,2 |
| 1911 | 312,1 | 309,4 | 443,5 | 643,8 | 399,6 | 2 108,4 |
| Павелічэнне ў 1911 г. у параўнанні з 1956 г. (разоў) | 1,9 | 2,3 | 2,5 | 2,7 | 1,7 | 2,2 |

У 1911 г. у Еўрапейскай Расіі і Польшчы па колькасці свіней у разліку на 100 жыхароў 1-е месца займала Курляндская губерня (22,9), 2-е — Гродзенская (22,5), 3-е — Мінская (22,4). На 10-м месцы знаходзілася Магілёўская губерня (17,7), на 11-м — Віцебская (16,7) і на 14-м — Віленская (15,9). Па 50 губернях Еўрапейскай Расіі прыходзілася 10, а з Царствам Польскім — толькі 9,6 свіней на 100 жыхароў [2, с. 14]. Такім чынам, Беларусь у пачатку XX ст. ператварылася ў рэгіён высокаразвітой свінагадоўлі. Хаця, калі параўнаць колькасць свіней у разліку на колькасць жыхароў, то ў Беларусі ў 1856 г. іх было 22,0, а ў 1911 — 19,0. Памяншэнне назіралася па ўсёй імперыі. Гэта было звязана з больш хуткім ростам насельніцтва ў параўнанні са статкам свіней. Разам з тым у 5 заходніх губернях гэта скарачэнне склала 3,0 свінні на 100 жыхароў, а ў Еўрапейскай Расіі — 5,3 [3].

---

[1] Падлічана згодна з данымі табліцы 1.

*Табліца 2*

**Колькасць свіней у разліку на 100 жыхароў [3]**

| Губерні / Год | Віленская | Віцебская | Гродзенская | Мінская | Магілёўская | Разам | Па 50 губернях Еўрапейскай Расіі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1956 | 20,0 | 18,2 | 21,7 | 24,0 | 26,2 | | |
| 1911 | 15,9 | 16,7 | 22,5 | 22,4 | 17,7 | 19,0 | 10,0 |
| Павелічэнне (+), памяншэнне (–) | –4,1 | –1,5 | +0,8 | –1,6 | –8,5 | –3,0 | –5,3 |

Афіцыйная статыстыка не ўтрымлівае даных аб колькасці свіней у памешчыцкіх гаспадарках, за выключэннем 1900 г. Відаць, да канца XIX ст. доля памешчыцкіх свіней у іх агульнай колькасці была нязначнай. Практычна да канца 70-х гг. адсутнічаюць звесткі аб развіцці памешчыцкай свінагадоўлі ў афіцыйных справаздачах і перыядычным друку. Толькі ў пачатку 80-х гг. указвалася, што ў маёнтках Ляўкі і Забалоцце памешчыкаў Мянжынскіх утрымлівалася да 100 галоў свіней [4, с. 48]. З канца XIX ст. «пачала развівацца свінагадоўля. Яна служыць важкім падспор'ем сельскай і гарадской гаспадаркам... У сучасны момант развядзеннем свіней займаюцца не толькі сяляне, але і памешчыкі» [5, с. 263]. Для паляпшэння пароды свіней самі гандляры прывозілі з замежжа кныроў і размяшчалі іх у вялікіх маёнтках. У 1900 г. на долю памешчыцкіх гаспадарак прыходзілася ўжо 420,6 тыс. свіней, альбо 20,0 % ад усяго статка. Трэцяя частка з іх прыпадала на Мінскую губерню [6, с. 7—9,12].

*Табліца 3*

**Колькасць прыватнаўласніцкіх свіней ад іх агульнай колькасці ў 1900 г. (тыс. галоў) [6, с. 7—9, 12]**

| Губерні | Усяго | З іх прыватнаўласніцкіх | % прыватнаўласніцкіх |
|---|---|---|---|
| Віленская | 416,0 | 99,4 | 23,9 |
| Віцебская | 344,5 | 66,5 | 19,3 |
| Гродзенская | 265,2 | 33,5 | 12,6 |
| Магілёўская | 473,8 | 91,0 | 19,2 |
| Мінская | 600,8 | 130,2 | 21,7 |
| **Разам** | **2 100,3** | **420,6** | **20,0** |

Зразумела, што памешчыкі займаліся не спажывецкай, а гандлёва-прадпрымальніцкай свінагадоўляй. Гэтаму садзейнічала і кан'юнктура цэн на рынках як на сала, так і мяса. У прыватнасці, з канца XIX ст. да 1911 г. цэны на свіное мяса ў 5 заходніх губернях выраслі ў сярэднім у 1,5 раза. Найбольш высокія цэны за 1 пуд мяса былі ў Гродзенскай губерні (615 кап.) і Мінскай (540 кап.). У цэлым кошт беларускага мяса ў 1911 г. склаў 542 кап. за пуд, а ў Еўрапейскай Расіі — толькі 474 кап. [7].

Аб выгадах развіцця свінагадоўлі сведчыць і факт, што ў Беларусі ўпершыню паяўляюцца злучныя пункты. У прыватнасці, у 1914 г. адзначалася, што «як мясцовую асаблівасць у галіне жывёлагадоўчых мерапрыемстваў неабходна адзначыць арганізацыю земскіх злучных пунктаў па свінагадоўлі ў Навагрудскім, Мозырскім і асабліва ў Пінскім паветах» [8, с. 96].

*Табліца 4*

**Дынаміка цэн на свіное мяса (у кап. за 1 пуд) [7]**

| *Гады* / *Губерні* | *1891/1900* | *1901/1905* | *1906/1910* | *1911* | *Павелічэнне ў 1911 г. у параўнанні з 1891—1900 гг. (разоў)* |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленская | 387 | 483 | 560 | 520 | 1,3 |
| Віцебская | 344 | 461 | 536 | 510 | 1,5 |
| Гродзенская | 445 | 519 | 592 | 615 | 1,4 |
| Магілёўская | 324 | 392 | 466 | 525 | 1,6 |
| Мінская | 339 | 425 | 532 | 540 | 1,6 |
| Разам (сярэдняя) | 368 | 456 | 537 | 542 | 1,5 |
| Па 50 губернях Еўрапейскай Расіі | 331 | 389 | 500 | 474 | 1,4 |

Прагрэс у развіцці памешчыцкай свінагадоўлі не мог быць магчымым без пашырэння і ўдасканалення кармавой базы. Гэта было звязана з павышэннем ураджаяў традыцыйных збожжавых культур і асабліва бульбы. У пачатку XX ст. на рост пагалоўя памешчыцкіх свіней станоўча паўплывала і развіццё малочнай гаспадаркі. Адходы ад перапрацоўкі малака таксама ішлі на корм свіней. Такім чынам, прагрэсіўныя працэсы ў земляробстве, агракультуры і таварнай жывёлагадоўлі знаходзіліся ва ўзаемасувязі і станоўча ўплывалі на развіццё сельскай гаспадаркі ў цэлым.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Статистические таблицы Российской империи за 1856 год. СПб., 1858. С. 11, 13, 35, 69, 71; Статистический временник Российской империи. СПб., 1866. Отд. 2. С. 242—243; Статистический временник Российской империи. СПб., 1875. Сер. 2. Вып. 10. С. 70—72, 75—76; Свод статистических сведений по сельскому хозяйству России к концу XIX века. СПб., 1903. Вып. 2. С. 8—9; Сведения о количестве скота в 1910 году по данным волостных правлений и уездной полиции. СПб., 1901. С. 7—9, 12; Сборник статистико-экономических сведений по сельскому хозяйству России и иностранных государств. СПб., 1913. С. 235—236; Отчет по ветеринарной части в России за 1911 год. СПб., 1914. Прил. С. 14.
3. Отчет по ветеринарной части в России за 1911 год. СПб., 1914.
4. Статистические таблицы Российской империи за 1856 год. СПб., 1858. С. 11, 13, 35, 69, 71; Отчет по ветеринарной части в России за 1911 год. СПб., 1914. Прил. С. 14.

5. *Перепелкин А. П.* Материалы к исследованию скотоводства и овцеводства в России. М., 1885.
6. Россия.... Верхнее Поднепровье и Белоруссия. СПб., 1903. Т. 9.
7. Сведения о количестве скота в 1900 году по данным волостных правлений и уездной полиции. СПб., 1901.
8. Свод статистических сведений по сельскому хозяйству России к концу XIX века. СПб., 1903. Вып. 2. С. 147; Сборник статистико-экономических сведений по сельскому хозяйству России и иностранных государств. СПб., 1913. Вып. 6. С. 600.
9. Вестник Минского губернского земства. 1914. № 3.

*SUMMARY*

*The author of the article pointed out that by the beginning of the 20th century, pig breeding had become the leading branch of the agricultural production of the gentry.*

УДК 947.6(042.3)+323(476)

*В. С. Смятаннікаў*

# РАЗВІЦЦЁ МАСАВАЙ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ (1970–1985 гг.)

Важнейшым напрамкам сацыяльнай палітыкі дзяржавы з'яўлялася развіццё фізічнай культуры. Яна разглядалася як сродак масавага аздараўлення насельніцтва і выхавання фізічна моцнага маладога пакалення з мэтай гарманічнага развіцця фізічных і духоўных сіл працоўных. Такі падыход да праблемы неаднаразова падкрэсліваўся ў дырэктыўных дакументах саюзных і рэспубліканскіх структур. Фізічная культура ўключала фізічнае выхаванне, спорт, спецыяльныя навуковыя веды, сістэму падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, развіццё і ўмацаванне матэрыяльнай базы, кіраванне фізкультурным рухам [1].

У 1970—1985 гг. у развіцці фізічнай культуры Беларусі сталі фарміравацца новыя кірункі, што тлумачылася шэрагам змяненняў у грамадстве. Так, істотна змянілася сацыяльная структура насельніцтва, гараджане па колькасці сталі пераважаць над вяскоўцамі, узрос агульнаадукацыйны ўзровень насельніцтва; у гараджан з развіццём сферы паслуг, павышэннем камфортнасці жылля і развіццём транспарту, стала больш вольнага часу.

Дзяржаўныя органы і грамадскія арганізацыі рэспублікі ўлічваючы сацыяльныя змены, якія адбываліся ў той час, імкнуліся напоўніць вольны час розных грамадскіх груп больш рацыяналь-